УДК 904:726:271.22(476)-788-055.2(476.5-21)

І. У. Магалінскі, *Полацкі дзяржаўны універсітэт, дэкан факультэта па рабоце з замежнымі студэнтамі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Полацк, Беларусь);*
Я. М. Торшын, *Дзяржаўны эрмітаж, сектар архітэктурнай археалогіі, старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат гістарычных навук (г. Санкт-Пецярбург, Расія);*
П. Л. Зыкаў, *Дзяржаўны эрмітаж, сектар архітэктурнай археалогіі, старшы навуковы супрацоўнік (г. Санкт-Пецярбург, Расія)*

Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў 2016 г.

У ліпені–жніўні 2016 г. на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў г. Полацку праводзіліся археалагічныя даследаванні. Агульнае кіраўніцтва працамі ажыццяўляў І. У. Магалінскі (Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Беларусь), метадычную дапамогу падчас прац аказвалі Я. М. Торшын і П. Л. Зыкаў (Дзяржаўны Эрмітаж, Расія). У археалагічных раскопках прымалі ўдзел студэнты-гісторыкі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама вучні сярэднеадукацыйных школ г. Полацка.

Асноўныя задачы, якія стаялі перад пачаткам археалагічных прац: выявіць і прывязаць на мясцовасці фундаменты храма-пахавальні XII ст.; лакалізацаваць рэшткі манастырскай трапезнай пачатку XX ст. (гл. малюнак).

Маштабныя археалагічныя даследаванні праводзіліся на месцы размяшчэння храма-пахавальні XII ст. у 1961–1964 гг. пад кіраўніцтвам М. К. Каргера і ў 1976 г. пад кіраўніцтвам П. А. Рапапорта [1–4]. Па выніках прац былі зроблены дзве розныя графічныя рэканструкцыі старажытнай пабудовы [3, мал. 2; 4]. У матэрыялах раскопак (палявых чарцяжах і справаздачах), а таксама ў публікацыях адсутнічала інфармацыя аб дакладным размяшчэнні храма-пахавальні.

У 1991 г. Беларускім рэстаўрацыйна-праектным інстытутам на тэрыторыі манастыра праводзіліся археалагічныя даследаванні, якія доўгі час заставаліся малавядомымі ў айчыннай гістарыяграфіі. Асноўнай задачай, якая стаяла перад гэтымі раскопкамі, было выяўленне стану помнікаў для магчымай рэстаўрацыі. Раскопкамі кіравала Н. І. Здановіч [5].

У ходзе гэтых прац была ***ўскрыта заходняя сцяна храма-пахавальні,*** а таксама выяўлены фрагменты сцен будынка трапезнай. Падчас работ упершыню ***ўдалося прывязаць храм-пахавальню на мясцовасці.*** Між тым прывязка выяўленых падчас даследаванняў аб'ектаў не дазваляе сёння надзейна лакалізаваць будынкі.

Для вырашэння пастаўленых задач па лакалізацыі і прывязцы на мясцовасці храма-пахавальні былі закладзены тры шурфы.

Шурф 1 быў разбіты на мяркуемым месцы паўднёвай сцяны паўднёвай галерэі храма-пахавальні, меў памеры 3,0 × 1,5 м і быў выцягнуты па восі поўнач–поўдзень.


Сцяна галерэі старажытнага храма была выяўлена ў шурфе на адзнаке 130.16–130.26 (па балтыйскай шкале). Кладка была прасочана да адзнакі 129.9. Сцяна была зроблена з плінфы на вапнава-цэментавай рошчыне ў тэхніцы «са схаваным радам». Шырыня сцяны – 0,79 м. Памеры плінфы 30,0–31,5 × 21–24 × 3,5 (см). Кладка выканана суцэльнымі гарызантальнымі радамі без падзелу структуры сцяны на вонкавыя паверхні і забутоўку.

Бок кладкі, звернуты да інтэр'ера галерэі, быў раскрыты падчас раскопак 1964 г. На яе паверхні захавалася зацірка схаваных радоў рошчынай, а таксама былі выяўлены два невялікія фрагменты фрэсак.

Знешні бок сцяны не ўскрываўся і быў закрыты слоем будаўнічага развалу, які складаўся з плінфы і вапнава-цэментавай рошчыны. Падчас расчысткі дадзенага слоя была выяўлена знешняя лапатка (шырыня – 0,54 м, вынас – 0,19 м). На ўсходняй бакавой плоскасці лапаткі захаваўся слой фасаднай тынкоўкі магутнасцю да 2,0 см са светлай вапнава-цэментавай рошчынай. На інтэр'ернай паверхні сцяны была выбіта штраба (глыбіня – 0,45 м, шырыня па фасадзе – 0,19 м), верагодна, для завядзення лагі падлогі.

Шурф 2 быў размешчаны на месцы заходняй сцяны асноўнага аб'ёму храма і заходняй сцяны галерэі. Шурф меў памеры 8,0 × 2,0 м і быў выцягнуты ў накірунку ўсход–захад.

Кладка сцяны асноўнага аб'ёму была выяўлена на адзнаке 130.94–130.65. Яна складалася з плінфы, складзенай у тэхніцы «са схаваным радам». Памеры плінфы 30 × 23–25 × 3,5–4,0 (см). Сустракаліся таксама цагліны шырынёй 15,0–16,0 см і даўжынёй 27,0 см. У забутоўке кладкі былі выкарыстаны буйныя валуны. Сцяна была прасочана да падэшвы. На гэтай адзнаке раскопкі былі спынены. Вывучэнне фундамента патрабавала павелічэння плошчы шурфа, аднак такія даследаванні выходзілі за межы задач археалагічных работ гэтага палявога сезона.



План археалагічных даследаванняў: *I* – рэканструкцыя плана храма-пахавальні XII ст.; *II* – меркаванае размяшчэнне будынка трапезнай пачатку XX ст. Тэрыторыя Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. г. Полацк. 2016 г.

На ўчастку інтэр'ернай плоскасці сцяны, якая знаходзілася на мяжы шурфа, выяўлена лапатка (даўжыня – 0,9 м, вынас – 0,3 м). У ніжняй частцы сцяны (ад падэшвы да адзнакі 130.30) яна не была перавязана са сцяной.

Да заходняга боку сцяны цэнтральнага аб'ёму храма, які звернуты да інтэр'ера галерэі, быў прыкладзены масіў кладкі таўшчынёй да 0,64 м. Як і лапатка ў інтэр'еры, гэтая прыкладка ў ніжняй частцы была не прывязана са сцяной да адзнакі 130.50. Масіў кладкі складаўся з двух участкаў, вертыкальнае шво паміж якімі было бачна з заходняга боку сцяны. Прыкладка была складзена з тых жа будаўнічых матэрыялаў, што і астатняя частка сцяны асноўнага аб'ёму храма.

На большай частцы паверхні сцяны асноўнага аб'ёму захаваліся значныя ўчасткі заціркі схаваных радоў кладкі. Моцна пашкоджаным з'яўляўся заходні бок прыкладкі. Тут вонкавая паверхня была поўнасцю сцёсана, і толькі каля падэшвы сцяны захаваліся фрагменты тынкоўкі і невялікі ўчастак фрэскі.

Кладка сцяны заходняй галерэі не захавалася. На яе месцы быў прасочаны роў, запоўнены будаўнічым смеццем, якое складалася як з будаўнічых матэрыялаў XII ст., так і з больш позніх цаглін. Каля паўночнай сценкі шурфа трасу фундаментнага рова перасякала высцілка з двух шэрагаў плінфы (адзнака 130.19–130.23). З усходняга боку яна злучалася са слаямі падлогі заходняй галерэі, а з поўдня да яе прымыкаў блок кладкі з плінфы, які зрушыўся са свайго месца і прасеў у роў пасля выбаркі фундамента. Магчыма, дадзеная высцілка з'яўляецца рэшткамі праёма ў заходняй сцяне галерэі.

На адкрытым у шурфе ўчастку інтэр'ера заходняй галерэі былі выяўлены ўчасткі першапачатковай падлогі XII ст. (адзнака 130.20–130.25). Яна ўяўляла з сябе слой цэментавай рошчыны, на якой быў пакладзены рад плінфы, перакрыты яшчэ адным слоем вапнавай рошчыны з зацёртай паверхняй. Гэтая падлога прымыкала да паверхняў кладкі асноўнага аб'ёму храма з боку галерэі. Невялікі ўчастак такой падлогі быў выяўлены ў вуглу паміж інтэр'ернай паверхняй сцяны асноўнага аб'ёму храма і бакавой гранню ўнутранай лапаткі.

Падрыхтоўкай пад падлогу на асобных участках з'яўляўся слой карычневага суглінку. Падлога была пакладзена на культурны слой, які складаўся з лінзаў гумусаванага супеску і гумусу.

Каля паўднёвай мяжы шурфа была раскрыта сценка плінфавага саркафага, які быў складзены з частак плінфы на вапнава-цэментавай рошчыне. З паўночнага боку саркафага, уздоўж усёй яго сцяны, была размешчана яма, запоўненая фрагментамі рошчыны і шматлікімі фрагментамі фрэсак.

Шурф 3 быў разбіты на мяркуемым месцы паўночнай сцяны паўночнай галерэі і меў памеры 3,0 × 1,5 м. У шурфе былі выяўлены рэшткі двух цагляных канструкцый. Адна з іх з'яўлялася ўчасткам паўночнай галерэі храма XII ст. Яна складалася з плінфы, пакладзенай на вапнава-цэментавай рошчыне. Вонкавыя паверхні кладкі былі разбураныя. Раскопкі каля сцяны былі спыненыя на адзнаке 129.53, таму з паўночнага яе боку была выяўлена толькі верхняя частка фундамента. Ён складаўся з камянёў і фрагментаў плінфы, пакладзеных на сухую. Прамежкі паміж імі былі занятыя гумусам і фрагментамі вапнава-цэментавай рошчыны. Фундамент не быў ускрыты да падэшвы, бо на адзнаке 129.53–129.58 на ўсёй плошчы шурфа была зачышчана паверхня культурнага пласта (чорны гумус), які адклаўся яшчэ да будаўніцтва храма.

Другая канструкцыя ўяўляла з сябе сцяну, паралельную першай, аднак складзеную з плінфы і буйнафарматнай цэглы-«пальчаткі» на рошчыне без цамянкі. Гэтая кладка была адзначана на плане храма, які быў складзены М. К. Каргерам па выніках раскопак 1961–1964 гг. Прызначэнне гэтай сценкі пакуль не высветлена.

Такім чынам, у выніку праведзеных даследаванняў стала магчымым дакладна вызначыць паўночную і паўднёвую мяжу руін храма-пахавальні. У той жа час заходняя мяжа старажытнага збудавання прасочана толькі па мяжы рова, які застаўся пасля разборкі кладкі заходняй сцяны галерэі XII ст. Аднак трэба ўлічваць, што, паводле даных раскопак 1964 г., да заходняга фасада галерэі далучалася вялікая прыбудова шырынёй да 9,0 м, якая была пабудавана з «пальчаткі». Гэтае збудаванне, нягледзячы на сваё позняе паходжанне, таксама з'яўляецца неад'емнай часткай руін храма-пахавальні.

У сезоне 2016 г. не рабіліся спробы пошуку апсіды храма. Як паказалі раскопкі 1976 г., усходнія часткі пабудовы захаваліся вельмі дрэнна. Ад іх засталіся толькі фундаментныя равы, выявіць якія магчыма толькі падчас раскопак вялікай плошчай.

Другой задачай, якая стаяла перад археалагічнымі працамі ў сезоне 2016 г., з'яўлялася ***лакалізацыя манастырскай трапезнай,*** пабудаванай у пачатку XX ст. Аснову для пошуку рэшткаў будынка склалі фотаматэрыялы, якія захоўваліся ў манастыры, даныя геарадарных даследаванняў, а таксама вынікі раскопак Н. І. Здановіч 1991 г.

Для выяўлення фундаментаў трапезнай былі даследаваны тры шурфы. *Шурф 1* быў размешчаны на мяркуемым месцы лакалізацыі паўночнай сценкі пабудовы. Памеры шурфа – 5,0 × 1,0 м, арыентацыя – поўдзень–поўнач. Культурны пласт шурфа пераадкладзены і прадстаўлены светла-карычневай, сухой, дробнакамкаватай глебай з уключэннямі бітай цэглы, пяску, а таксама значнай колькасці смецця першай паловы XX ст. Падчас разборкі другога пласта ў межах шурфа выўлены фрагмент чарапной каробкі і калючы дрот. Гэтыя, а таксама некаторыя іншыя знаходкі з шурфа (фрагменты бутэлек з кляймом, дэталі нямецкай амуніцыі), верагодна, адносяцца да часоў Вялікай Айчыннай вайны. Шурф быў выбра-

ны да глыбіні 1,3 м. На самым яго дне былі зафіксаваны фрагмент фундамента паўночнай сцяны трапезнай (шырыня – 0,6 м), а таксама частка размешчанай перпендыкулярна ёй унутранай сцяны будынка.

На паўднёвы захад ад шурфа 1 з мэтай пошуку заходняй сцяны трапезнай быў закладзены *шурф 2* памерамі 2,0 × 1,0 м з арыентацыяй поўдзень–поўнач. Запаўненне шурфа было аналагічнае запаўненню шурфа 1. Разбіралі шурф да глыбіні 1,8 м. На яго дне былі выяўлены фрагменты фарбаванай падлогі зялёнага колеру, якая дамыкала да рэшткаў сцяны, прадстаўленай толькі на ўзроўні фундаментных камянёў.

У *шурфе 3*, які меў памеры 3,0 × 1,0 м і быў закладзены згодна з паказаннямі геарадара, на ўзроўні 2–3 пластоў зафіксаваны рэшткі драўлянай вымасткі з дошак, моцна пашкоджаных агнём. Дошкі абапіраліся на цагляны слуп прамавугольнай формы і, верагодна, з'яўляліся падлогай у нейкай гаспадарчай пабудове, якая непасрэдна прымыкала да будынка трапезнай.

Нягледзячы на той факт, што падчас прац археалагічна атрымалася зафіксаваць толькі паўночную мяжу будынка, ведаючы яго агульныя памеры, магчыма прыблізна лакалізаваць месца яго размяшчэння, што дазволіць спланаваць далейшы ход будаўнічых прац на тэрыторыі манастыра (гл. малюнак).

У ходзе археалагічных прац была выяўлена дастаткова прадстаўнічая калекцыя археалагічных знаходак, якая налічвае 1690 пазіцый. Улічваючы характар нашых раскопак, якія ў асноўным лакалізаваліся на участках, якія ўжо ўскрываліся папярэднімі даследчыкамі помніка, у калекцыю знаходак трапілі шматлікія дробныя фрагменты фрэсак, абмазкі і плінфы.

Найбольшую цікавасць выклікаюць знаходкі фрагментаў цэглы XII ст. – плінфы, сярэднія памеры якой складаюць 30,0–31,5 × 21,0–24,0 × 3,5 (см). Акрамя таго, падчас даследаванняў былі выяўлены фрагменты і цэлыя экзэмпляры цэглы-«пальчаткі» XVII–XVIII стст. Усе цагліны зроблены з чырвонай гліны з якасным абпалам. Падчас раскопак былі знойдзены таксама венчыкі керамічных гаршкоў з акруглым краем і пакатым плечыкам, характэрныя для культурных слаёў Полацка XVII–XVIII стст. [6, с. 101]. Важнай групай керамічных знаходак з'яўляюцца пліткі старажытнай падлогі храма-пахавальні, пакрытыя палівай жоўтага і зялёнага колераў.

Такім чынам, археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў г. Полацку, праведзеныя ў палявым сезоне 2016 г., дазволілі вырашыць асобныя спрэчныя пытанні ў тапаграфіі помніка. У ходзе прац атрымалася дакладна прывязаць на мясцовасці храм-пахавальню XII ст., а таксама лакалізаваць месца размяшчэння будынка трапезнай пачатку XX ст.

Літаратура

1. Каргер, М. К. Отчёт об археологических раскопках, проведённых архитектурно-археологической экспедицией Ленинградского государственного университета в г. Полоцке в 1961 г. / М. К. Каргер // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 119.

2. Каргер, М. К. Отчёт об археологических раскопках, проведённых архитектурно-археологической экспедицией Ленинградского государственного университета в г. Полоцке в 1962 г. / М. К. Каргер // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 166.

3. Каргер, М. К. Отчёт об археологических раскопках, проведённых архитектурно-археологической экспедицией Ленинградского отделения института археологии АН СССР и Ленинградского государственного университета в г. Полоцке в 1964 г. / М. К. Каргер // ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. – Арх. № 251.

4. Раппопорт, П. А. Полоцкое зодчество XII века / П. А. Раппопорт // СА. – 1980. – № 3. – С. 142–161.

5. Здановіч, Н. І. Справаздача пра археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ўлетку 1991 г. / Н. І. Здановіч // Беларусі праектна-рэстаўрацыйны інстытут. Аб'ект: Рэканструкцыя былога манастырскага парку ў г. Полацку (на правах рукапісу).

6. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 267 с.

Резюме

И. В. Магалинский, Е. Н. Торшин, П. Л. Зыков

Предварительные результаты археологических исследований на территории Спасо-Евфросиниевского монастыря в 2016 г.

В статье представлены предварительные результаты археологических исследований 2016 г. на территории Спасо-Евфросиниевского монастыря в г. Полоцке. Отмечается, что в ходе археологических работ удалось решить ряд спорных вопросов в топографии памятника, точно привязать на местности фундаменты храма-усыпальницы XII в., а также локализовать место размещения здания монастырской трапезной начала XX в.

Summary

I. Mahalinski, J. Torshyn, P. Zykau

Preliminary results of the archaeological research in the territory of Spasa-Jeŭfrasinnieŭski monastery in 2016

The article presents preliminary results of the archaeological research in the territory of Spasa-Jeŭfrasinnieŭski monastery in Polack in 2016. It is noted that during the archeological works a number of controversial issues in topography of the monument were solved and foundations of the shrine of 12th century were accurately georeferenced and also the location of the refectory of the beginning of 20th century was determined.

Паступіў 05.07.2017 г.